ДУК «Бібліятэчная сетка
Хоцімскага раёна»
Дзіцячая бібліятэка-філіял

# БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ – ДЗЕЦЯМ



ВІРТУАЛЬНАЯ ВЫСТАВА



Нічыпаровіч Галіна



Хадасевіч-Лісавая Кацярына



Аўласенка Генадзь



Ліпскі Уладзімір



Ткачоў Васіль



Ляхновіч Павел

*Вядома, што літаратура развівае шматлікія здольнасці дзяцей. Кнігі вучаць шукаць, разумець і любіць. Менавіта, мастацкая літаратура ўзбагачае ўнутраны мір дзіцяці. Юныя чытачы, акунуўшыся ў свет дзівосных кніг, мараць і фантазіруюць, робяцца вынаходнікамі і адкрывацелямі, падарожнічаюць па фантастычных краінах і вучацца проста рабіць добрыя ўчынкі.*

*Сучасная беларуская дзіцячая літаратура прадстаўлена шырокім колам сучасных празаікаў і паэтаў.*



Гардзей Віктар



Карлюкевіч Алесь



Ждан Алег



Зэкаў Анатоль



Давідовіч Сяргей



Жабко Яніна

***Сваім юным чытачам мы раім прачытаць наступныя кнігі:***




**Аўласенка, Г. Дашачка і чароўныя акуляры : казачная аповесць : для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Г. П. Аўласенка ; мастак А. Балыш. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2014. — 104 с. : іл.**

ISBN 978-985-11-0804-2.
ББК 84(4Бей)-44
А93

Казачная аповесць дзіцячага пісьменніка Генадзя Аўласенкі распавядае пра дзяўчынку Дашачку, якая кожнае лета адпачывае ў бабулі і заўсёды з ёй здараюцца нейкія незвычайныя гісторыі. Аднойчы, пасля сустрэчы з Вожыкам у чароўных акулярах такое пачалося…, што лепш за ўсё аб гэтым прачытаць самому ці з бацькамі, бабулямі і дзядулямі, сёстрамі, братамі і сябрамі, разглядзець малюнкі і атрымаць задавальненне ад цудоўнай кнігі.




**Бензярук, Р. М. Патапка і яго сябры : казкі : для дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту / Р. М. Бензярук ; мастак С. А. Волкаў. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2013. — 72 с. : іл.**

ISBN 978-985-11-0635-2.
ББК 84(4Бей)

Кніга знаёміць з цікавымі з’явамі прыроды і незвычайнымі прыгодамі зверанят. Самым дапытлівым адрасуюцца казкі-загадкі, а дзіцячым лялечным тэатрам — п'еса-казка «На паляне, каля ёлкі...».




**Галубовіч, Я. Шчодрая ваверка : казкі : для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Янка Галубовіч ; мастак Юлія Пякіна. — Мінск : Звязда, 2015. — 96 с.**

ISBN 978-985-575-018-6.
ББК 84(4Бей)-44
Г15

Напісаныя прыгожай, вобразнай, сакавітай мовай казкі Янкі Галубовіча ўзнімаюць маральныя і філасофскія праблемы і на прыкладзе персанажаў-жывёл вучаць дзяцей любіць прыроду, быць працавітымі, цаніць сяброўства, дапамагаць слабейшым і тым, хто патрапіў у бяду.

Для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту.




**Гардзей, В. К. Сарочына цырульня : вершы / Віктар Гардзей. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 56 с. : іл.**

ISBN 978-985-02-1402-7.
ББК 84(4Беі)
Г20

Новая паэтычная серыя для дзяцей «Журавінка» адкрываецца кнігай Віктара Гардзея «Сарочына цырульня». Нязмушаны гумар вершаў, назіральнасць аўтара, жыццялюбства і тонкае адчуванне свету адразу бярэ ў палон чытача.

Вашае чытанне станецца вясёлым і пазнавальным — а, значыць, несумненна карысным!




**Давідовіч, С. Ф. Дзівос з дзівосаў : казкі зблізку і здалёку / Сяргей Давідовіч ; мастак Сяргей Волкаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. — 150 с.**

ISBN 978-985-02-1597-0.
ББК 84(4Беі)
Д13

Гэта першая кніжка казак вядомага паэта і празаіка Сяргея Давідовіча. Творы вызначаюцца не толькі тонкім гумарам, але маюць павучальны падтэкст.




**Жабко, Я. Г. Загадкі казачнай хаткі : для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту / Я. Г. Жабко ; мастак А. А. Пашкевіч. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2014. — 24 с. : іл.**

ISBN 978-985-11-0821-9.
ББК 84(4Беи)-5
Ж42

У новую кнігу «Загадкі казачнай хаткі» ўвайшлі вершаваныя дзіцячыя загадкі пазнавальнага і павучальнага характару. Напісаныя ў займальнай форме, яны будуць спрыяць выхаванню дабрыні, цікаўнасці, назіральнасці, а таксама чуйнасці да роднага слова.




**Ждан, О. Приключения тритэшек в Беларуси : повести : для детей среднего школьного возраста / Олег Ждан ; художник Светлана Ковалевская. — Минск : Звязда, 2014. — 80 с. : ил.**

ISBN 978-985-7083-25-1.
ББК 84(4Беи=Рус)-44
Ж42

В книге две небольшие повести, объединенные действующими лицами, Ребята 5 класса  решают навестить интернат для детей-инвалидов. Идея не «мировая», но приносит удовлетворение всем ребятам.




**Зэкаў, А. М. Вожык вёз саракановжак : вершы: для дзяцей малодшага школьнага ўзросту / Анатоль Зэкаў ; мастак Вікторыя Міронцава. — Мінск : Звязда, 2014. — 32 с. : іл. — (Вясёлы калейдаскоп).**

ББК 84(4Беі)
ISBN 978-985-7083-82-4
З-97

Хлопчыкі і дзяўчынкі, «нашы малодшыя сябры» — птушкі, звяры ды іншыя насельнікі планеты, а таксама рэчы, якія акружаюць кожнага з нас у паўсядзённым жыцці, — гэта і ёсць героі новай кнігі Анатоля Зэкава. У ёй шмат пазнавальнага, павучальнага і, вядома ж, займальнага. У героях кнігі Анатоля Зэкава многія пазнаюць сябе. ад душы пасмяюцца з іх і адначасова задумаюцца, ці заўсёды правільныя іх асабістыя ўчынкі.




**Зэкаў, А. М. Не казкі пра Сашку / Анатоль Зэкаў ; мастак Г. Хінка-Янушкевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 127 с.**

ISBN 978-985-02-1328-0.
ББК 84 (4Бен)-5
З-97

«Не казкі пра Сашку» — гэта мініяцюры з жыцця рэальнай дзяўчынкі, у якіх няма нічога выдуманага.




**Карлюкевич, А. Н. Путешествие Шубуршуна : сказка: для детей младшего и среднего школьного возраста /Алесь Карлюкевич ; перевод с белорусского Олега Ждана ; художник Кирилл Задворный. — Минск : Звязда, 2014. — 96 с. : ил.**

ISBN 978-985-7083-81-7.
ББК 84(4Бei)
К 23

Эта книга, повествующая о необычном персонаже, который не может не полюбиться читателю. Он привлекает своей добротой, смелостью, находчивостью. Вместе с ним вы отправитесь в увлекательное путешествие, полное приключений, тревог, а также встреч с другими персонажами. И с каждым из них Шубуршун старается подружиться, а некоторым даже приходит на помощь.




**Карлюкевіч, А. М. Новыя прыгоды Шубуршуна : казка : для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Алесь Карлюкевіч ; мастак Марыя Каратаева. — Мінск : Звязда, 2014. — 40 с. : іл.**

ISBN 978-985-7059-59-1.
ББК 84(4Бей)-44
К23

Гэта чарговая серыя казак пра няўрымслівага героя і заўзятага падарожніка. І тут яго чакаюць не менш цікавыя і незвычайныя адкрыцці.




**Карлюкевіч, А. М. Крыніца паноў Ельскіх : казка / Алесь Карлюкевіч ; іл. В. В. Дударэнкі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. — 47 с.**

ISBN 978-985-02-1511-6.
ББК 84(Беі)
К23

Галоўны герой казкі Алеся Карлюкевіча «Крыніца паноў Ельскіх» — вандроўнік яшчэ той: і з паштовымі маркамі выпраўляецца ў вялікую дарогу, і роднымі сцежкамі ходзіць. І не варта перажываць, што цудоўная кніга хутка заканчваецца. «Крыніца паноў Ельскіх» пачатак аповесці-казкі пра падарожжы беларускага школьніка і па прасторах роднай краіны, і па ўсім свеце. Як працяг з'явяцца цікавыя кнігі «Як Жаўна лясным жыхарам кватэры будавала» і «Падарожжа паштовай маркі».




**Карлюкевіч, А. М. Падарожжа паштовай маркі : казка / Алесь Карлюкевіч ; мастак В. Дударэнка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2015. — 47 с.**

ISBN 978-985-02-1506-2.
ББК 84(4Беі)
К23

Галоўны герой казкі Алеся Карлюкевіча «Падарожжа паштовай маркі», вядомы чытачу па кнігах «Крыніца паноў Ельскіх», збірае паштовыя маркі. Дзякуючы такому захапленню ён і ажыццяўляе свае казачныя падарожжы па ўсім свеце. Але ўвесь свет яму патрэбны толькі дзеля таго, каб болей ведаць і любіць Беларусь.




**Ліпскі, У. С. Сакрэты колераў вясёлкі : апавяданні, казкі, вершы / Уладзімір Ліпскі. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. — 120 с. : іл. — (Серыя «Бібліятэка часопіса “Вясёлка”»).**

ISBN 978-985-471-660-2.
ББК 84(4Бей)-5
Л 61

Кніга Уладзіміра Ліпскага насычана гумарам і жывымі назіраннямі. Пісьменнік з цеплынёй і спагадай распавядае пра розныя здарэнні з жыцця дзяцей, знаходзячы ў кожным хараство і цуд.

Менавіта праз гэтыя сітуацыі пісьменнік спакваля вучыць дзетак быць шчырымі і сумленнымі, добрымі і паслухмянымі; паважаць і шанаваць гісторыю сваёй Бацькаўшчыны. А бацькі пасля прачытання гэтай кнігі змогуць мудра адказаць на самыя розныя пытанні маленькіх чамучак.




**Ляхновіч, П. А. Ігнась-чарадзей : аповесць / Павел Ляхновіч ; мастак Віталь Буйвід. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. — 78 с.**

ISBN 978-985-02-1441-6.
УДК 821.161.3-93 ББК 84(4Бей)-44
Л98

Перад галоўным героем кнігі Ігнаськам Сокалам паўстала адразу шмат выпрабаванняў. Найбольш сур’ёзнае — самота. Ён суцяшаўся марамі. І мары ягоныя здзяйсняюцца — Ігнаська знаходзіць чароўны валун, з дапамогай якога можа пераўвасабляцца ў каго і ў што захоча. З кожным новым пераўвасабленнем Ігнаська трапляе ў цікавыя, але і небяспечныя прыгоды. У школе ўзнікае першае яго дзіцячае каханне-прыязь да аднакласніцы. Імкнучыся звярнуць на сябе ўвагу абранніцы, Ігнаська парушае запавет і губляе чароўныя магчымасці. Але не перастае марыць.




**Мінскевіч, С. Л. Усмешка Жалобнай Каралевы, альбо Таямніца магнітнага замка : аповесць легендарных часоў : для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту / Серж Мінскевіч ; мастак Наталля Сустава, — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013 — 270 с.**

ББК 84(4Бей)-44
I8ВК 978-985-02-1360-0.
М62

Перад вамі — «аповесць легендарных часоў». У ёй апавядаецца пра падзеі, якія адбываліся ў запаветным мінулым нашай часціны населенага свету, у паўміфічных краінах, дзе пралягалі шляхі-дарогі адважных вандроўнікаў.
Гэта фэнтазі, з квестам і экшэнам, з паданнямі і экзотыкай. Яго героі трапляюць у драматычныя, камічныя і часам у вельмі небяспечныя сітуацыі. Ім давядзецца разгадаць шмат таямніц і вытрымаць неверагодныя выпрабаванні.




**Нічыпаровіч, Г. М. Забавы дзетвары : вершы : для дзяцей малодшага школьнага ўзросту / Галіна Нічыпаровіч ; мастак Алена Лось. — Мінск : Звязда, 2015. — 32 с. : іл. — (Серыя «Вясёлы калейдаскоп»).**

ISBN 978-985-575-011-7.
ББК 84(4Беі)
Н 70

Новая кніжка Галіны Нічыпаровіч «Забавы дзетвары» — вельмі цікавая. Тут вы прачытаеце пра хатніх жывёл і лясных жыхароў, пра цікавыя з'явы і назіранні, якія адбываюцца ў прыродзе. Створаныя ў вершах вобразы заўсёды мілыя і абаяльныя, што станоўча ўздзейнічае на пачуцці чытачоў.




**Падарожжа ў свет дзівосаў : для малодшага школьнага ўзросту / укладальнік П. П. Саковіч. — Мінск : Беларусь, 2013. — 264 с. : іл.**

ISBN 978-985-01-1003-9.
ББК 84(4Беі)
П 12

У кнізе сабраны казкі сучасных беларускіх аўтараў на беларускай і рускай мовах. Іх тэматыка вельмі разнастайная, а героі — не толькі звычайныя казачныя персанажы — людзі, звяры і птушкі, тут ёсць і прыдуманыя, фантастычныя істоты, добрыя і злыя. Чытача чакаюць цікавыя падарожжы, прыгоды і адкрыцці. Творы вызначаюцца пазнавальным зместам, прасякнуты любоўю да нашай Бацькаўшчыны, прыроды, падсветлены гумарам, цёплай усмешкай.




**Слабашпіцкі, М. Ці далёка да Афрыкі? : казкі: для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Міхайла Слабашпіцкі ; пераклад з украінскага Алеся Карлюкевіча ; мастак Алена Лось. — Мінск : Звязда, 2015. — 80 с. — іл.**

ISBN 978-985-575-021-6.
ББК 84(4Укр)-44
С 47

У гэтай кніжцы жывуць найразумнейшыя папугаі. І з гэтай кніжкі вельмі добра відаць афрыканскіх кракадылаў. А цікавых таямніц у гэтай кніжцы болыш, чым старонак!




**Ткачоў, В. Ю. Высокі страх : апавяданні / Васіль Ткачоў ; мастак Т. В. Кубліцкая. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. — 54 с.**

ISBN 978-985-02-1501-7.
ББК 84(4Беі)
Т 48

Каму спатрэбіліся цёплыя абноўкі халоднай зімою? Што такое высокі страх? Хто выпіў ваду? Пра ўсё гэтае і шмат што іншае даведаюцца юныя чытачы, калі пазнаёмяцца з новай кнігай пісьменніка, лаўрэата прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Васіля Ткачова. Героі яго твораў самі робяць добрыя справы і вучаць іх рабіць іншых.




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Казкі Сіняй падушкі : для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак Рыта Цімохава. — Мінск : Звязда, 2013. — 200 с. : іл.**

ISBN 978-985-7059-42-3.
ББК 84(4 Беі)
Х14

Хлопчык Стасік разам з мамай зрабіў сабе падушку. А пасля выявілася, што ўнутры яе жывуць маленькія істоты, якія ведаюць шмат казак і цікавых гісторый. Кожную ноч, як толькі Стасік засынае, ён сустракаецца са сваім новым сябрам — камячком Пухлікам. Разам яны здзяйсняюць падарожжы ў самыя незвычайныя месцы.

Казкі Сіняй падушкі цікавыя і займальныя. Аматарам прыгод яны абавязкова прыйдуцца даспадобы. Запрашаем чытачоў разам з галоўнымі героямі перанесціся ў Краіну Сноў, дзе можа адбывацца самае неверагоднае...




**Як Мурлыку ашукалі : казкі : для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / укладальнік Вольга Аляксеева ; мастак Марыя Каратаева. — Мінск : Звязда, 2014. — 152 с. — (Казачны куфэрак).**

ISBN 978-985-7083-19-0.
ББК 84(4 Беі)
Я 44

Маленькі чытач знойдзе тут для сябе казкі на любы густ — вершаваныя і празаічныя; пра хлопчыкаў і дзяўчынак, пра жывёльны свет і нават пра фантастычных істот.

Казкі сучасных беларускіх пісьменнікаў не пакінуць чытача раўнадушным да навакольнага свету, навучаць беражліва адносіцца да прыроды, з павагай ставіцца да бацькоў і любіць Радзіму.

Кнігі
можна атрымаць у
*дзіцячай бібліятэцы-філіяле*

Наш адрас:
вул. Ленінская, 2а.